ра кіламетра»); 6) ва ўтварэнні дзеясловаў і дзеяслоўных форм («ідзець», «гавора», «ходзюць», «распораны», «чытая кнігу» замест «ідзе», «гаворыць», «ходзяць», «распораты», «чытаючы кнігу»). Цяжкасці ў засваенні М.н. звязаны з наяўнасцю ў мове варыянтных форм слоў («кішэнь» і «кішэня», «салат» і «салата»), уплывам дыялектаў («тры зіме», «дубе», «браце», «нося», «ходзя»), сітуацыяй білінгвізму і ўплывам рус. мовы («вялікая сабака», «драўляны камод»), асаблівасцю мовы-крыніцы, з якой запазычваецца слова («івасі», «цэцэ», «аташэ») і інш. фактарамі.

*Літ.*: Б у р а к Л.І. Сучасная беларуская мова. Мінск, 1974; Беларуская граматыка: У 2 ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985; Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія. Мінск, 1997; К р ы в і ц к і А.А. Дыялекталогія беларускай мовы. Мінск, 2003. *В.В.Урбан.*

**МАРФАЛО́ГІЯ** (ад грэч. morphē форма + ...*логія*) у м о в а з н а ў с т в е, 1) сістэма механізмаў мовы, якая аб'ядноўвае словы як носьбіты граматычных значэнняў, іх граматычныя класы, а таксама забяспечвае канструяванне і разуменне словаформ. 2) Раздзел *граматыкі*, які вывучае заканамернасці функцыянавання і развіцця дадзенай сістэмы. Тэрмін «М.» для абазначэння галіны лінгвістыкі, якая займаецца вывучэннем форм слова, быў уведзены ў 19 ст. Прадметам М. з'яўляюцца часціны мовы і іх лексічна-граматычныя разрады, граматычныя катэгорыі і формы, а таксама парадыгмы зменных слоў з усімі іх варыянтамі і марфаналагічнымі характарыстыкамі. Асн. адзінкай М., як і *лексікалогіі*, з'яўляецца слова. Аднак у адрозненне ад лексікалогіі М. вывучае не індывід., а катэгарыяльныя значэнні слоў. На падставе гэтых абагульненых значэнняў словы і іх відазмяненні (словаформы) групуюцца ў граматычныя класы, разрады, тыпы. Агульная (тэарэт.) М. займаецца інвентарызацыяй марфалагічных спосабаў, якія выкарыстоўваюцца ў мове ў цэлым, марфалагічных значэнняў, а таксама тыпаў фармальна-сэнсавых адносін паміж знакамі. Прыватная М. (М. асобнай мовы) даследуе сістэму граматычных катэгорый і спосабаў іх выражэння, уласцівых пэўнай мове. Гіст. М. вывучае змяненне форм і семантыкі канкрэтных марфем, гіст. развіццё структуры слова, пераразмеркаванне гукавога матэрыялу і кампанентаў значэння паміж марфемамі, а таксама ўзнікненне новых і знікненне старых граматычных катэгорый і інш. **Функцыянальная** М. аналізуе суадносіны марфалагічных катэгорый і кантэксту. М. цесна звязана з сінтаксісам, словаўтварэннем, лексікалогіяй, фаналогіяй і інш. раздзеламі мовазнаўства. У бел. мовазнаўстве даследавана большасць граматычных катэгорый у кантэксце тых або інш. часцін мовы, а таксама асн. лексічна-граматычныя класы слоў: назоўнік (М.А.Жыдовіч, А.І.Наркевіч), прыметнік (М.Г.Булахаў), лічэбнік (П.В.Вярхоў, А.Я.Супрун), займеннік (Т.П.Сцяшковіч), дзеяслоў (М.Ц.Кавалёва, Ю.Ф.Мацкевіч, П.П.Шуба), прыслоўе (П.П.Шуба), прыназоўнік (А.М.Шаранда, П.П.Шуба), часціцы (І.А.Кісялёў) і інш. Пры вывучэнні М. выкарыстоўваюцца асн. прыёмы апісальнага (дыстрыбутыўны аналіз, прыёмы трансфармавання, аналіз па непасрэдна складальных) і параўнальна-супастаўляльнага метадаў.

*Літ.*: Граматыка беларускай мовы. Т. 1: Марфалогія. Мінск, 1962; Б у л ы к а А.М., Ж у р а ў с к і А.І., К р а м к о І.І. Гістарычная марфалогія беларускай мовы. Мінск, 1979; Беларуская граматыка. Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985; Ш у б а П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; П л у н г я н В.А. Общая морфология: Введение в проблематнку. М., 2012. *Д.В.Дзятко.*

**МАРФАНАЛО́ГІЯ**, раздзел граматыкі, які вывучае фаналагічную структуру *марфем*, асаблівасці выкарыстання іх адрозненняў для выражэння марфалагічных значэнняў. У слав. мовах сустракаюцца адрозненні марфем на месцы якой-н. фанемы неаднафанемнага морфа, калі ў другім морфе выступае інш. фанема (слых-/слух- «слыхавы — слухаць»), адна з сярэдніх фанем морфа адсутнічае ў другім морфе (сон-/сøн- «сон — сну»), адзін з морфаў складае частку другога морфа (-іва-/-ва-/-а «атаясамліваць», «разладжваць», «аклікаць»). Марфаналагічныя з'явы ўзнікаюць на перасячэнні фаналогіі і марфалогіі: гэта заканамернасці функцыянавання фаналагічных сродкаў, абумоўленыя марфалагічн■. Звесткі аб тым, што ў мове паводзіны фанем унутры і на мяжы марфем нятоесныя, расцэньваюцца як марфаналагічныя. Да марфаналагічных характарыстык адносяць фармальныя асаблівасці структуры слова і марфем, што яго ўтвараюць. Яны выяўляюць зменлівасць пры іх аб'яднанні ў адно цэлае і дапамагаюць сігналізаваць аб выконваемых імі граматычных функцыях. Наяўнасць марфаналагічных характарыстык выяўляецца пры супастаўленні форм аднаго парадыгматычнага ці словаўтваральн■га рада. Яна выступае маркёрам адпаведнай словазмяняльнай ці словаўтваральнай апазіцыі (я «лячу» — мы «ляцім», «бярозøка — бярозак», «луг — лужок», «сонца — сонечны»). Сярод з'яў, што адбываюцца ўнутры і на мяжы марфем (марфемным шве) і садзейнічаюць розным зменам у іх фанемным складзе (фаналагічнай структуры), вылучаюцца: чаргаванне фанем, накладанне морфаў, інтэрфіксацыя, усячэнне і нарашчэнне матывавальнай асновы. Усе групы фанем, якія рэгулярна замяшчаюць адна другую ў межах марфаналагічна маркіраванай марфемы вылучаюцца ў рады фанемных чаргаванняў. Адзінкі фанетычнага, фаналагічнага і марфаналагічнага ўзроўню падаюцца ў дужках: [ ] — гукі, / / — фанемы, < ~ > — чаргаванні (альтэрнанты), { } марфанемы. Паколькі сістэма чаргаванняў любой мовы ўяўляе шэраг